# Рецензии

# Рэцэнзіі

# Reviews

*Пригодич Н. Г.* **Авторская неологизация в белорусском языке** : пособие. Минск : БГУ, 2021. 175 с.

*Прыгодзіч М. Р.* **Аўтарская неалагізацыя ў беларускай мове** : дапаможнік. Мінск : БДУ, 2021. 175 с.

*Pryhodzich M. R.* **Author's neologisation in Belarusian language** : a manual. Minsk : Belarus. State Univ., 2021. 175 p.

Неалогія – раздзел мовазнаўства, што пачаў развівацца параўнальна нядаўна. Ён узнік, таму што ва ўмовах функцыянавання мовы ўтварэнне новых слоў уяўляе несупынны працэс, і яго вывучэнне з'яўляецца адной з важнейшых задач мовазнаўцаў.

Адным з даследчыкаў, якія актыўна займаюцца вывучэннем індывідуальна-аўтарскіх неалагізмаў, з'яўляецца доктар філалагічных навук, прафесар М. Р. Прыгодзіч. Апошняя яго работа – дапаможнік для студэнтаў-філолагаў «Аўтарская неалагізацыя ў беларускай мове» – кніга, у якой сабраны неабходны для вывучэння беларускай неалогіі тэарэтычны і практычны матэрыял.

Дапаможнік складаецца з трох раздзелаў.

У першым раздзеле – «Аўтарская неалагізацыя як моўны феномен» – аўтар змястоўна і паслядоўна прасочвае развіццё ўсходнеславянскага індывідуальна-аўтарскага словаўтварэння з часоў Францыска Скарыны да нашых дзён, акрэслівае адметныя рысы аўтарскіх неалагізмаў, грунтоўна і ўсебакова вызначае прычыны і ўмовы іх з'яўлення, месца і ролю ў маўленні, а таксама шляхі пераходу аказіянальных слоў у разрад узуальных. На прыкладзе прыслоўяў ён пераканаўча паказвае асаблівасці словаўтварэння індывідуальна-аўтарскай лексікі, яе функцыянальны статус.

Коратка, але дакладна ў дапаможніку асвятляецца гісторыя вывучэння аказіянальнай лексікі беларускай мовы, звязаная з імёнамі А. І. Наркевіча, М. Г. Булахава, Г. І. Басавай, У. А. Бобрыка, І. П. Казейкі, М. В. Шабовіча, Н. У. Чарнаброўкінай, В. А. Зразікавай і інш.

У дапаможніку зроблены акцэнт на словатворчасць вядомага паэта-лірыка, паэта-песенніка і даследчыка індывідуальна-аўтарскай неалогіі 1920–30-х гг., стваральніка ўласных неалагізмаў М. В. Шабовіча. Аўтар аналізуе асаблівасці словатворчасці паэта, адзначае яго ўменне выбраць патрэбны словаўтваральны сродак, каб не пераступіць мяжу, не дайсці да «моўнага свавольства» (с. 30).

Завяршаецца першы раздзел пытаннямі і заданнямі, праца з якімі арыентавана на паглыбленае вывучэнне студэнтамі праблем тэорыі неалогіі, рашэнне практычных задач па пошуку і ўсебаковым аналізе індывідуальна-аўтарскіх неалагізмаў. Пытанні і заданні могуць выкарыстоўвацца як для індывідуальнай, так і для групавой працы студэнтаў.

У другім раздзеле – «Выбраныя даследаванні аўтарскіх неалагізмаў» – чытач знаёміцца з арыгінальнымі працамі беларускіх даследчыкаў, у якіх асвятляюцца разнастайныя пытанні беларускай


CC BY NC

неалогіі. Так, у артыкулах Г. І. Басавай разглядаюцца заканамернасці ўтварэння і выкарыстання аказіяналізмаў як моўна-выяўленчых сродкаў у сучаснай беларускай паэзіі, аналізуюцца назоўнікі, створаныя па канкрэтным узоры. В. А. Зразікава паводле словаўтваральных і семантычных асаблівасцей назоўнікаў-неалагізмаў вылучае пяць іх разнавіднасцей у творах В. Ластоўскага. Даследчыца падкрэслівае адзначаны ўплыў кантэксту і сэнсавай сувязі з утваральнымі асновамі на фарміраванне лексічнага значэння неалагізмаў. На аснове гэтай сувязі В. А. Зразікава вылучае дзве групы неалагізмаў: з эксплліцытнай і імпліцытнай актуалізацыяй семантыкі.

Акрамя таго, у дадзеным раздзеле згадваюцца працы, якія будуць спрыяць развіццю навукова-даследчыцкіх уменняў студэнтаў і дапамогуць ім авалодаць навыкамі словаўтваральнага, семантычнага, марфалагічнага, кантэкстуальнага, стылістычнага аналізу, а таксама метадамі абагульнення, сістэматызацыі, тыпалагізацыі, інтэрпрэтацыі, апісання.

У склад трэцяга раздзела – «Слоўнік аўтарскіх неалагізмаў» – уключана 988 слоў, утвораных пераважна паэтамі і пісьменнікамі на працягу XX – пачатку XXI ст. Сярод іх прызнаныя майстры мастацкага слова Р. Барадулін, З. Бядуля, Н. Гілевіч, П. Глебка, У. Дубоўка, М. Зарэцкі, У. Караткевіч, Я. Колас, Я. Купала, В. Ластоўскі, М. Лужанін, П. Панчанка, М. Танк, П. Трус і многія іншыя пісьменнікі, а таксама тыя, хто толькі пачынае свой творчы шлях у літаратуры. У ліку аўтараў неалагізмаў адзначаецца і мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел, Патрыяршы экзарх усяе Беларусі. У слоўніку змешчаны аўтарскія неалагізмы, якія выбраны з рознастылявых тэкстаў і характарызуюцца неаднолькавай словаўтваральнай структурай. Увага да іх будовы дазволіць выкладчыкам разнастаіць працу са студэнтамі. Так, лексічны матэрыял слоўніка дазваляе вызначыць шэраг спосабаў словаўтварэння, якія падаюцца ў беларускіх граматыках, і звярнуць увагу на тыя, што апісаны пакуль яшчэ толькі ў спецыяльных працах. Няпоўны іх пералік выглядае наступным чынам:

- суфіксацыя (*пацучызм* < *пацук* + *-ызм*);
- нульсуфіксацыя (*шчым* < *шчым*/*е*/(*ць*) + *-ø*);
- прэфіксацыя (*антыабстрактны* < *анты-* + *абстрактны*);
- прэфіксацыя + суфіксацыя (*засветлафорыць* < *за-* + *светлафор* + *-ы-ць*);
- прэфіксацыя + дэпостфіксацыя + дэсуфіксацыя + нульсуфіксацыя (*непрасып* < *не-* + *прасып*/*а*/*цца*/ + *-ø*);
- суфіксацыя + постфіксацыя (*шчодрыцца* < *шчодр*(*ы*) + *-ы-* + *-цца*);
- прэфіксацыя + суфіксацыя + постфіксацыя (*ашлюбавацца* < *а-* + *шлюб* + *-ава-* + *-цца*);
- прэфіксацыя + асноваскладанне + нульсуфіксацыя (*асмуглачолы* < *а-* + *смугл*(*ы*) + *-а-* + *чал*(*о*) + *-ø-ы*; чаргаванне а||о);
- асноваскладанне + суфіксацыя (*звонкаглінны* < *звонк*(*і*) + *-а-* + *глін*(*а*) + *-н-ы*);
- асноваскладанне + нульсуфіксацыя (*аблокабровыя* < *аблок*(*і*) + *бров*(*ы*) + *-ø*);
- асноваслоўваскладанне (*аддана-наіўны* < *аддан*(*ы*) + *-а-* + *наіўны*);
- словаскладанне (*аер-чарот* < *аер* + *чарот*);
- суфіксацыя + плюралізацыя (*Амерычкі* < *Амерык*(*а*) + *-к-і*);
- імпазіцыя (*выдро* < *выдр*(*а*) + *вядро*);
- дэсуфіксацыя + суфіксацыя (*наплявізм* < *напляв*/*а*/(*ць*) + *-ізм*);
- дэсуфіксацыя + нульсуфіксацыя (*непрагляд* < *непрагляд*/*н*/(*ы*) + *-ø*);
- дэсуфіксацыя + імпазіцыя (*намуляваць* < *намаляваць* + *Муляв*/*ін*/);
- слоўны тмезіс (*аграўсімпром* < *агра*||*пром* + *усім*);
- дэсуфіксацыя + суфіксацыя (*адзетак* < *адзе*/*нн*/(*е*) + *-так*);
- аферэзіс (немарфемнае скарачэнне пачатку слова) + асноваскладанне (*сталіназаўры* < *Сталін* + *-а-* + /*дына*/*заўры*, /*іхтыя*/*заўры*);
- апакопа (немарфемнае скарачэнне канца слова) + суфіксацыя (*іглініць* < *іглін*/*к*/(*і*) + *-і-ць*);
- апакопа + асноваслоўваскладанне (*аўтатабун* < *аўта*/*мабіль-н*/(*ы*) + *табун*);
- дэсуфіксацыя + аферэзіс + асноваскладанне (*сеціратура* < *сец*/*ів*/(*а*) + *-і-* + /*літа*/*ратура*);
- галафразіс (*неганісабакузхаты* < *не* + *гані* + *сабаку* + *з* + *хаты*);
- галафразіс + суфіксацыя (*нічоганяробнікі* < *нічога* + *не* + *раб*/*і*/(*ць*) + *-нік-і* і чаргаванне *е*||*я*, *а*||*о*, *б'*||*б*).

Сярод індывідуальна-аўтарскіх неалагізмаў у слоўніку ёсць лексічныя адзінкі, якія адрозніваюцца ад іншых слоў, утвораных адным і тым жа спосабам, структурнымі асаблівасцямі. Пры асноваслоўваскладанні і словаскладанні, напрыклад, словы могуць утварацца не з двух слоў, як звычайна, а з трох і больш: *мужыцка-беларуска-партызанскі* (с. 147), *узнёсла-рамантычна-любоўна-лірычны* (с. 166), *амлет-рулет-сардэлькі* (с. 120) і інш. Спосабам прэфіксацыя + словаскладанне + суфіксацыя ўтвораны дзеяслоў *надорэміфасоліць* (с. 13), утваральнай базай якога з'явіліся пяць слоў – назваў нот: до, рэ, мі, фа, соль.

Нярэдка можна знайсці словы, утвораныя праз адну або дзве ступені. Назоўнік *паўднёвавейнасць* (с. 157), напрыклад, утвораны не ад

прыметніка, як звычайна ўтвараюцца назоўнікі з суфіксам *-асць*, а праз ступень, ад прыметніка і дзеяслова, паколькі прыметнік *паўднёвавейны* ў мове адсутнічае. Студэнты могуць скласці схему ўтварэння дадзенага слова: *паўднёвавейнасць < [паўднёвавейны] < паўднёвы + веяць*. Дзеепрыметнік *аблаўрэачаны* (с. 113) утвораны не ад дзеяслова *аблаўрэаціць* (такі ў мове не існуе), а непасрэдна ад назоўніка: *аблаўрэачаны < [аблаўрэаціць] < лаўрэат*.

У раздзел «Слоўнік аўтарскіх неалагізмаў» уключаны наватворы, якія з'яўляюцца рознымі часцінамі мовы: назоўнікамі, прыметнікамі, дзеясловамі і яго формамі (дзеепрыметнік і дзеепрыслоўе), прыслоўямі, безасабова-прэдыкатыўнымі словамі. Гэта дазваляе разгледзець словаўтваральныя асаблівасці кожнай часціны мовы асобна.

Відавочна, што матэрыял, змешчаны ў дапаможніку, раскрывае розныя аспекты айчыннай неалогіі, у тым ліку рэдкія і спецыфічныя спосабы словаўтварэння, асаблівасці семантыкі і функцыянальныя магчымасці індывідуальна-аўтарскай лексікі. Выданне, безумоўна, знойдзе належнае прымяненне ў працы выкладчыкаў вышэйшых навучальных устаноў.

***А. В. Солахаў***[1]

[1]*Алексей Васильевич Солохов* – кандидат филологических наук, доцент; доцент кафедры специальной педагогики и методик дошкольного и начального образования факультета дошкольного и начального образования Мозырского государственного педагогического университета имени И. П. Шамякина.

*Аляксей Васільевіч Солахаў* – кандыдат філалагічных навук, дацэнт; дацэнт кафедры спецыяльнай педагогікі і методык дашкольнай і пачатковай адукацыі факультэта дашкольнай і пачатковай адукацыі Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя І. П. Шамякіна.

*Aliaxiej V. Solakhau*, PhD (philology), docent; associate professor at the department of special pedagogy and methods of preschool and primary education, faculty of preschool and primary education, Mozyr State Pedagogical University named after I. P. Shamiakin.

E-mail: *solakhau@yandex.by*